**УДК 821.161.3-311.6*В.Быкаў**

***К. В. Якаўленка***

# ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ Ў ВАЕННАЙ ПРОЗЕ ВАСІЛЯ БЫКАВА: НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦІ “СОТНІКАЎ”

*Артыкул прысвечаны даследаванню праблемы выбару ў ваеннай прозе В. Быкава. Аналізуюцца паводзіны герояў аповесці “Сотнікаў” у экстрэмальнай сітуацыі, калі патрэбна выбіраць паміж жыццём і смерцю, чалавечай годнасцю і здрадніцтвам. Акцэнт робіцца на свядомым выбары і адказнасці за яго. Даводзіцца, што пісьменнік выбар герояў тлумачыць праз іх мінулае, менавіта там закладзены вытокі характару, матывацыя будучых учынкаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

В. Быкава адносяць да пісьменнікаў-экзістэнцыялістаў. Ён найбольш яскрава адлюстроўвае эстэтыку экзістэнцыялізму ў беларускай літаратуры. Памежная сітуацыя, маральны выбар – гэтыя паняцці адносяцца да экзістэнцыялізму і бяруць свае вытокі з гэтага напрамку.

“Экзістэнцыялізм (ад лац. *existential* ‘існаванне’) – гэта філасофска-эстэтычны напрамак XX ст., які таксама называлі «філасофіяй існавання». Экзістэнцыялізм пачаў фарміравацца ў французскай літаратуры ў сярэдзіне 1930-х гг. у творчасці такіх філосафаў і пісьменнікаў як Ж. П. Сартр, С. дэ Бавуар, А. Камю і інш.” [1, с. 244]. Важнымі катэгорыямі экзістэнцыялізму з’яўляюцца трывога, чаканне, раскаянне, безнадзейнасць і страх. Гэта асноўныя настроі чалавека. Як сцвярджаюць экзістэнцыялісты: “страх – гэта неад’емная ўласцівасць чалавечага існавання” [2, с. 217].

У экзістэнцыялізме існуюць два пункты гледжання на праблему выбару. Згодна з першым – чалавек выбірае ўчынак як сродак дасягнення пастаўленай мэты. Выбар здзяйсняецца адносна таго, што залежыць ад чалавека. У такім выпадку ён ужо загадзя вызначаны. Другі пункт гледжання мае толькі выбар вышэйшай мэты. Чалавек наўмысна робіць выбар, які станоўча паўплывае на чалавецтва. Пераадоленне канфлікту, які ўзнікае на жыццёвым шляху, падразумявае, што чалавек усведамляе свае ўчынкі і імкнецца падабраць альтэрнатыву з найменшай колькасцю зла. У канкрэтных абставінах мы выбіраем мараль і тым самым даказваем сваю маральную свядомасць.

“Экзістэнцыяльны выбар патрабуе ад суб’екта актуалізацыі паглыбленага самааналізу і выяўлення пэўных чалавечых якасцей. З-за гэтага выбару перабудоўваецца сістэма каштоўнасцей і адносін, змяняецца жыццё чалавека, яго дзейнасць, учынкі. У экзістэнцыялізме праблема адказнасці чалавека за сваё быццё з’яўляецца актуальнай у сучасным грамадстве. Быць свабодным – гэта значыць дзейнічаць і думаць так, як хочацца табе самому, а не так, як хочуць іншыя. Менавіта ў памежнай сітуацыі чалавек ўсведамляе самога сябе” [2, с. 220–221].

Выбар – самавызначэнне асобы ў дачыненні да прынцыпаў, дзеянняў, рашэнняў. У творах В. Быкава вельмі часта прысутнічае памежная сітуацыя. З’яўляецца выбар паміж жаданнем “застацца ў жывых” і “чалавекам унутры чалавека”. Праблема выбару ў творах вырашалася больш разнастайна і востра, усе ўчынкі разглядаліся больш дакладней, а лёс людзей быў апісаны падрабязна і вельмі трагічна. В. Быкаў ставіў для сябе задачу разгледзець наступныя пытанні: “Што такое чалавек перад знішчальнаю сілай бесчалавечных абставін? На што ён здольны, калі магчымасці абараніць жыццё вычарпаны ім да канца і прадухіліць смерць немагчыма?” [3, с. 78]. Вайна – гэта якраз тыя экстрэмальныя ўмовы, дзе чалавек праяўляецца ўсебакова, выяўляе рысы характару, якія маглі не праявіцца ў мірны час, дзе ён вымушаны рабіць выбар... Вайна – гэта час

небывала аголеных адчуванняў, дзе найбольш відавочна праяўлялася чалавечая сутнасць, такія якасці, як сапраўдны гуманізм, чалавечнасць, самаадданасць.

У ваенных аповесцях (такіх як “Жураўліны крык”, “Трэцяя ракета”, “Мёртвым не баліць” і інш.) В. Быкаў імкнуўся пранікнуць у сутнасць характару, вызначыць яго прыроду, а таксама разгледзець абставіны, у якіх знаходзіцца персанаж. Звычайна ў аповесцях абмежаванае кола персанажаў, усяго два-тры чалавекі: гэта суседзі па акопе, партызанская група, таварышы, аб’яднаныя адной справай. Але гэта людзі, звязаныя лёсам падчас выпрабаванняў, у якіх раскрываецца сутнасць чалавека больш глыбока і моцна, чым у звычайных абставінах.

Аповесць “Сотнікаў” – гэта адзін з самых дасканалых і глыбокіх твораў пісьменніка. Твор вызначаецца філасофскім роздумам аб чалавечым абавязку і гуманізме. Як вядома, сюжэт аповесці ўзяты з жыцця самога аўтара. В. Быкаў пасля вайны сустрэў таварыша, які супрацоўнічаў з немцамі. Гэтая сустрэча і падштурхнула на стварэнне аповесці. У ёй асэнсоўваецца праблема адказнасці чалавека за лёс людзей, а таксама паказваецца здрадніцтва адных герояў і духоўная веліч, высакароднасць іншых. Аповесць пабудавана на чаргаванні раздзелаў, у якіх кожны з галоўных герояў (Рыбак і Сотнікаў) выступаюць на першы план. Дзякуючы такой пабудове, можна супастаўляць і параўноўваць паводзіны герояў і іх матывы, якімі яны кіраваліся ў пэўнай сітуацыі. Аповесць ўскладняецца тым, што ўбірае ў сябе голас адпаведнага персанажа і імкнецца адлюстраваць яго погляд на падзеі. Такім чынам, аўтар клапоціцца пра глыбіню і дакладнасць, ёмістасць і пераканаўчасць псіхалагічнага аналізу.

У аповесці героі мала кажуць пра свае ідэалы, пра адносіны да вайны, пра высакароднасць мэт у барацьбе з фашызмам. Але за гэтыя ідэалы і мэты яны аддаюць сваё жыццё. В. Быкаў даследуе ўнутраны свет Сотнікава і выяўляе найтанчэйшыя зрухі ў яго псіхалагічным стане. Гераічнасць Сотнікава паказваецца ў аповесці з асаблівай выразнасцю і глыбокім філасофскім асэнсаваннем. Нягледзячы на тое, што Сотнікаў не выканаў заданне, ён застаўся чалавекам у бесчалавечнай сітуацыі. У памежнай сітуацыі герой захоўвае вернасць сваім перакананням і сваёй чалавечай сутнасці. Ён турбуецца, каб яго смерць не была марнай. Пра гэта Сотнікаў кажа так: “Як і кожная смерць у барацьбе, яна павінна нешта сцвярджаць, нешта адмаўляць і па магчымасці здзейсніць тое, што не паспела здзейсніць жыццё. Інакш навошта жыццё? Надта трудна яно даецца чалавеку, каб безразважна ставіцца да яго канца” [4]. Такія разважанні героя выяўляюць яго склад мыслення, які адбіўся на ўсю стылістыку аповесці з яе моцным аналітычна-філасофскім пачаткам. Герой адчувае абавязак перад людзьмі і самой будучыняй, таму робіць правільны выбар. Калі Сотнікаў трапляе ў палон да паліцаяў, ён думае пра смерць са зброяй у руках як пра самую найвялікшую раскошу. Нават перад смерцю Сотнікаў імкнецца сваёй мужнасцю падтрымаць хлапчука ў будзёнаўцы і іншых сумленных людзей, якія чакалі пакарання. Для В. Быкава вельмі важна было паказаць, як паводзяць сябе героі, гледзячы ў вочы смерці.

Другім галоўным героем аповесці, сутнасць характару якога В. Быкаў раскрыў вельмі добра, з’яўляецца Рыбак. У першых раздзелах аповесці Рыбак па-таварыску трымаецца разам з Сотнікавым і паказаны добрым партызанам: дае свой ручнік Сотнікаву, каб той прыкрыў прастуджаную шыю, дзеліцца ежай. Але яго натура пачала праяўляцца па-іншаму, калі ён разам з Сотнікавым уцякаў ад паліцаяў. У гэты момант Рыбак паспеў адарвацца, а Сотнікаў пачаў адстрэльвацца і быў паранены. Рыбак думаў, што Сотнікаў загінуў і не хацеў ісці да яго, каб праверыць ці застаўся жывым баец. Нягледзячы на тое, што на вайне дзейнічаў закон “гінь сам, а таварыша выручай”, Рыбак баяўся зноў ісці пад кулі і спадзяваўся на тое, што Сотнікаў загінуў, і яму можна не клапаціцца пра яго. Але, калі пачаліся зноў стрэлы, Рыбак кінуўся ратаваць Сотнікава. Усё ж гэта смелы ўчынак, але хістанні героя насцярожваюць. У выніку Рыбак пераходзіць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

на бок ворага і становіцца паліцаем. Свой выбар герой апраўдвае жаданнем жыць.

Галоўныя героі адрозніваюцца адзін ад аднаго сваімі ўчынкамі. Высакароднасць Сотнікава выяўляецца ў эпізодзе пра яго пакаранне. Ён выбівае ў сябе з-пад ног падстаўку, каб не даць зрабіць гэта Рыбаку. Сотнікаву хочацца, каб у Рыбака, які яшчэ не запэцкаў сваіх рук крывёю таварыша, была магчымасць адумацца і не страціць канчаткова сваю душу. Самае істотнае, што ў Рыбака не хапіла духоўнай моцы, каб выстаяць да канца ў бесчалавечных абставінах, калі патрабавалася за сумленнасць і адданасць заплаціць сваім жыццём. У гэтым плане Сотнікаў і Рыбак вельмі розныя. Першы гатовы аддаць сваё жыццё за Радзіму, а другі робіць усё, каб застацца жывым. В. Быкаў паставіў герояў перад выбарам: быць жывым здраднікам або мёртвым героем. Сотнікаў, як відаць з аповесці, прайшоў гэтыя выпрабаванні годна, чаго нельга сказаць пра Рыбака.

Пісьменнік імкнуўся высветліць прычыны маральнага выбару герояў і зразумець, чаму ў экстрэмальных абставінах кожны з іх зрабіў менавіта такі выбар. Пра памежную сітуацыю выказаўся М. Тычына: “В. Быкава цікавіць найперш чалавек, яго характар, паводзіны ў экстрэмальнай сітуацыі, калі размова ідзе пра жыццё і смерць. Звычайна ён шукае вытокі характару ў мінулым героя, выяўляе зноў і зноў складаную залежнасць героя і абставін. Прычым абставіны заўсёды складваюцца так, што ад самога чалавека амаль нічога не залежыць, застаецца вельмі вузкі выбар, і менавіта ў гэты момант выяўляецца сапраўдная духоўная сутнасць гэтага ці іншага чалавека” [5, с. 648–649].

У ваеннай аповесці “Сотнікаў” В. Быкаў адлюстроўвае псіхалагічны стан герояў, якія трапілі ў экзістэнцыяльную сітуацыю і вымушаны зрабіць выбар паміж здрадай і жыццём. У аповесці пісьменнік паказвае ўчынкі двух галоўных герояў, як яны паводзяць сябе перад знішчальнай сілай абставін. Сотнікаў свядома ідзе на самазнішчэнне, выбар яго прадуманы, узвышаны. Рыбак выбірае жыццё, але якім яно будзе, жыццё здрадніка, і ці не пашкадуе герой пра свой выбар? Пісьменнік дае магчымасць задумацца над гэтым няпростым пытаннем кожнаму чытачу.

**Літаратура**

1 Яцухна, В. І. Тэорыя літаратуры : дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. – 279 с.

2 Кулик, С. П. История философии / С. П. Кулик, Н. У. Тиханович. – Минск : Вышэйшая школа, 2007. – 316 с.

3 Бугаёў, Дз. Я. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе : дапаможнік для настаўнікаў / Дз. Я. Бугаёў, М. І. Верціхоўская, В. У. Верціхоўская. – Мінск : Аверсэв, 2005. – 282 с.

4 Быкаў, В. Сотнікаў / В. Быкаў // Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Vasil_Bykau/Sotnikau.html. – Дата доступу : 25.04.2022.

5 Тычына, М. Пад знакам Быкава / М. Тычына // Быкаў, В. У. Выбраныя творы / В. У. Быкаў. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ